

# ГІСТОРЫЯ

## БЕРАСЦЕЙСКІ МАНЕТНЫ ДВОР І ЯГО КАРОТКАЯ ГІСТОРЫЯ

**Мынца, альбо манетны двор, у Берасці быў створаны па рашэнні Варшаўскага сейма ад 22 сакавіка 1659 г., дзе спецыяльнай пастановай «Mennica W. X. Litew.» вызначалася, што «менніца будзе створана ў ВКЛ для сучасных асаблівых спажыванняў у Рэчы Паспалітай, абдумваючы спосабы выплаты нашаму войску вінаватыя запазычанасці. Таму з агульнай згоды пастанаўляем, каб яе ў Берасці [Brześciu Litewskim] заснаваць і як хутчэй паставіць... І ў першую чаргу дазваляем адчаканіць адзін мілліён шэлягамі».**

Але разбуральная і працяглая вайна, ахапіўшая практычна ўсю тэрыторыю ВКЛ, надоўга прымусіла забыць аб выкананні гэтай пастановы Варшаўскага сейма. Толькі 6 ліпеня 1665 г. было прынята канчатковае рашэнне аб пачатку эмісіі медных літоўскіх солідаў альбо шэлегаў у Берасці, атрымаўшых народную мянушку «баратынкі».

Каб зразумець, якія ўмовы для гэтай важнай справы на той час існавалі ў Берасці, паглыбімся спачатку ў падзеі 1660 г., якія для горада і яго жыхароў аказаліся катастрафічнымі.

### Літоўскі паход 1659 г. маскоўскага князя Івана Хаванскага Тараруя

Не даследуючы ў даннай працы трагічных падзей 1659–1660 гг. для нашых мясцін, прывядзём дзве вытрымкі сучасных ваенных гісторыкаў, расійскага і польскага, якія апіраюцца на архіўныя крыніцы.

Маскоўскі гісторык Алег Курбатаў піша:

«Спусташыўшы г. Каменец, маскоўскія палкі ў ноч на 29 снежаня падыйшлі па лёдзе Заходняга Буга і “ізгонам” узялі “вялікі горад” Брэст (РГАДА. Ф. 210. Оп. 5. Д. 87. Л. 2). Праўда, у добра забяспечаным і ўмацаваным замку замкнуліся чатыры роты пяхоты на чале з “немчынам італьянскай зямлі Ергыкам Кандратам”, якія адбілі першыя прыступы. Хаванскі адступіў за горад “атабарыўшыся вазамі” і адправіў пагоню за ўцякаючымі літоўскімі абозамі» .

Польскі гісторык Кшыштаф Касажэцкі аб той жа падзеі паведамляе наступнае:

«8 студзеня маскоўскія войскі былі ўжо пад Берасьцем. Яны адразу занялі горад. Напэўна, ужо ў гэты дзень спрабавалі здабыць штурмам Берасьцейскі замак. Аднак залога пад камандаваньнем пяхотнага гетманскага ротмістра Сьвянціцкага, якую зь перабольшваньнем ацэньвалі ў цэлыя 2 тыс. жаўнераў, адбіла непрыяцеля, на якога таксама значнае ўражаньне мусілі зрабіць моцныя фартыфікацыі Берасьцейскай крэпасьці. Расейцы адступілі ад Берасьця і, перайшоўшы праз Буг, сталі лягерам у недалёкай ваколіцы паміж Берасьцем і Белай. Аднак яны не намерваліся так лёгка адмовіцца ад важнай мэты, якой было авалоданьне Берасьцейскай крэпасьцю. Яны таксама не спалохаліся, як, можа, меркавала берасьцейская залога, яе ўмацаваньняў» .

А далей здарылася тое, чаго менш за ўсё чакаў непрыяцель. У замку, дзе схавалася ад ворага шмат навакольнай шляхты і мяшчан, з дазволу камандавання пача-

лося піршаства, як быццам берасцейцы дабылі перамогу над Хаванскім. І гэты бяздумны і ашалелы пір працягваўся некалькі дзён, пакуль адзін з маскоўскіх вязняў, якіх утрымлівалі ў турме замка, не ўцёк у ноч на 3 студзеня (А. Курбатаў) альбо 13 студзеня (К. Касажэцкі) і хутка аказаўся ў лагеры Хаванскага. Вось так аб гэтым паведамляе Алег Курбатаў, карыстаючыся расійскімі архіўнымі дакументамі:

«У ноч на 3 студзеня 1660 г. адзін са зняволеных у замку маскоўскіх вязняў (дараванне за палоннае цярпенне атрымалі ў сакавіку 1660 г. 26 "брэсцкіх сядзельцаў" (РГАДА. Ф. 396. Оп. 2. Д. 313. Л. 43, 44 об.) змог выбрацца за сцены [замка] і папярэдзіць Хаванскага, "што ўсе п'яныя". Той неадкладна, "маючы з сабою драбіны", даскакаў да Брэста, пачаў прыступ і на гэты раз узяў горад. Яго "выпалілі і высяклі", не пашкадаваўшы і многіх мірных жыхароў: "жанчын і мужчын, шляхту і не шляхту, дарослых і малых, нават грудных дзяцей у тым мястэчку і замку бязлітасна забілі". Целы забітых (ад 1 700 да 1 900 чалавек) былі кінуты без пахавання ў роў крэпасці (Pamietniki Samuela i Boguslawa Kazimierza Maskiewiczow. Wroclaw, 1961. S. 273, 274; Walewskij A. Historia wyzwolenia Rzeczypospoltej. Krakow, 1872. T. II. S. 144, 145 ; Vorbek-Lettow M. Skarbnica pamieci. Wroclaw, 1968. S. 288). Каменданта, ротмістраў і шмат іншых палонных (усяго 50 чалавек) Хаванскі адправіў у Маскву (РГАДА. Ф. 210. Оп. 17. Д. 73. Л. 125–130)» .

Такая вось страшная і трагічная справа адбылася ў Берасці 13 студзеня 1660 г. (па К. Касажэцкаму). Дзень, які ў тысячагадовай гісторыі Берасця мае права на ўтрыманне ў памяці. Хутка пасля трагічных падзей у студзені 1660 г. у Берасцейскі замак, які, заўважым, застаўся ў выніку раптоўнага штурму неразбураным, прыбыў аўстрыйскі афіцэр, капітан Разенштэйн, якога паслаў генерал Готфрыд Гайштэр для наладжвання кантактаў з Хаванскім. Аб гэтым пасольстве ў Берасці капітан склаў падрабязную справаздачу, у якой дастаткова адвёў месца таму, што бачыў сваімі вачыма. Гэты рапарт пазней цытаваў



Баратынка 1665 года



Mennica W. X. Litew.

15. NAleży to do porządku y pożytku powſzechnego, aby Mennica erygowana była, w W.X.Lit: oſobliwie w teraźnieyſzych Rzeczypoſp: potrzebach, obmyślaiąc ſpoſoby do wypłacenia woyſkom Naſzym winnego długu. Zaczym za zgodą powſzechną uchwalamy, [redacted] y iako nayprędzey wyſtawiona była. Co zlecamy Wielmożnemu Adminiſtratorowi na ten czas Skarbu W.X.Lit. żeby to *ad effectum* przywiodł, koſztem z podatkow Rzeczypoſp: A żeby to tym porządniey y ſkuteczniey ſtać ſię mogło, zlecamy Deputatom do Trybunału Skarbowego na tym Seymie naznaczonym, żeby tamże w Grodnie pod czas tego Trybunału namowili, y doſtatecznie poſtanowili, iakoby Mennica W.X.L. w ſwoie ryzę wprawiona była, ſtoſuiąc ſię *ad uniformitatem* Mennice Koronney. Y naypierwey pozwalamy wybić Million ieden ſzelągami.

Рашэнне Варшаўскага сейма ад 22 сакавіка 1659 года аб стварэнні мынцы ў Берасці

генерал Гайштэр, прыводзячы паміж іншымі і словы капітана Разенштэйна:

«Што датычыць паводзін маскалёў, я пераканаўся… амаль на свае вочы, што яны супраць сваіх непрыяцеляў забойствамі, пажарамі і вогнішчамі ваююць. Апошнія смаркачы з маскоўскага войска не прабачаюць ні гарадам, ні замкам, ні вёскам, але ўсіх жыхароў бяз розьніцы: жанчын, мужчын, шляхту, ня шляхту, дарослых і малых, нават немаўлят пры грудзях у гэтым горадзе [у Берасьці] і ў замку бязьлітасна пазабівалі, некаторым рукі і ногі зьвязалі і жыўцом пяклі, некаторых кіямі і корбачамі на сьмерць біць загадвалі. І сапраўды, каля 1 700 трупаў, г. зн. галоў, выцягнутых з замку, пакрытых соломай і непахаваных, яшчэ перад нашым ад'ездам ляжала. Пажадай іх, Божа, у апошні дзень ускрасіць да збаўленьня… (Walewskij A. Historia wyzwolonej Rzeczypospoltej wpadajacej pod jarzmo domowe za panowania Jana Kazimierza (1665–1660). Krakow, 1872. T. II. S. 145; Vorbek-Lettow M. Skarbnica pamieci. Wroclaw, 1968. S. 288)».

Гэта ўсё паказвае на тое, што Берасце, як горад, у пачатку 1660 г. перастаў існаваць, але заставаўся замак, які Хаванскі загадаў яшчэ больш умацаваць і пасадзіў там гарнізон з 1 000



Першы ліст інвентара фартэцыі Берасцейскай ад 6 студзеня 1661 года. AGAD. Варшава



Інвентар замка 1682 г., у якім фігуруюць камяная піўніца і памяшканні, дзе магла знаходзіцца мынца. НГАБ. Мінск.

жаўнерамі. Гэты маскоўскі гарнізон, грабячы і знішчаючы наваколле, заставаўся ў замку да канца 1660 г. Але пры канцы 1660 г. пад пагрозай штурму замка і надыходзячай зімы маскоўцы далі згоду на капітуляцыю, якая адбылася раней дамоўленай даты 24 снежня 1660 г.:

«Расейцы павінны былі [пры выхадзе з замка] кідаць свае харугвы пад ногі каралеўскіх камісараў. Потым скруціць іх і пакласьці на свае вазы. Дамова прадугледжвала, што іх завязуць да маскоўскіх межаў. Ім можна было забраць толькі мушкеты і кулі на пяць зарадаў. Усю дарогу мусілі несьці іх зьвешанымі ўніз, а таксама ім нельга было да самых царскіх межаў раскручваць сваіх штандараў» .

Праўда, пакінулі замак ужо не 1 000 жаўнераў, а толькі 600, пры гэтым частка з іх адразу перайшла на каралеўскую службу.

Такім чынам, ні пры ўзяцці замка маскоўцамі ў пачатку 1660 г., ні пры іх капітуляцыі ў канцы 1660 г. каралеўскаму войску, разбуральных штурмаў фартэцыі, у ваенным сэнсе гэтага слова, не здарылася. Гэта можа азначаць адно, што замкавая тэрыторыя ў 1661 г. заставалася ў Берасці адзіным месцам, прыстасаваным для жыцця і нейкай практычнай дзейнасці.

У замку пасля капітуляцыі не знайшлі шмат багаццяў, на што вельмі спадзяваліся, але нечакана выявілі шмат стратэгічнага прадукту – солі: цэлых 100 бочак. Гэта стала прычынай інвентарызацыі замка, якую загадаў зрабіць кароль Ян Казімір Францішку Бялінскаму, які на той момант з'яўляўся генеральным камендантам усіх войск пад Берасцем.




Магчымая лакалізацыя Берасцейскай мынцы ў замку на розных планах і на здымку Google _6

## Інвентар Фартэцыі Берасцейскай ад 6 студзеня 1661 г.

Змест інвентару Берасцейскага замка ад 6 студзеня 1661 г. не толькі надзвычайна цікавы дакумент, але і з'яўляецца надта важнай гістарычнай крыніцай для адпаведнага ўспрымання вынікаў трагічных падзей, якія здарыліся ў Берасці ў 1660 г. Поўнасцю інвентар Берасцейскага замка надрукаваны ўпершыню ў працы: «Інвентары Берасцейскага замка і горада пасля 1660 г.». Таму прывядзём толькі яго ўрыўкі, якія могуць мець адносіны да разглядаемай тэмы:

«Інвентар Фартэцыі Берасцейскай па дэакупацыі ад непрыяцельскіх рук... У годзе 1661, дня 6 студзеня складзены мною, Аляксандрам Слізнем, стольнікам ашмянскім... віцэ эканомам берасцейскім...

Будынкі: Будынак вялікі, які перароблены ў шпіхлер для захавання збожжа, калісьці гэты дом быў судовым, перад акупацыяй з замка перанесяны да акопаў; будынак з дзвюма белымі хатамі Я. М-ці пана Яна Звера цалкам перанесены ў замак; розных будаванъ, хат і пякарэнь, перанесяных з горада ў замак, штук – 86(!); будынкаў з гарышчамі для пражывання – 4; лазень – 3; на бульварыку з боку горада капліца, зробленая з хаткі – поўная ікон, са складзеным асобным рэестрам за подпісам папа, так як іконы з розных касцёлаў і цэркваў; хат у вале з дошак – 2; доўгая шопа, дзе соль была – 1; іншых хлеўчыкаў з драніц – 5; крам – 2; на валах штакеты з дрэва і абломкі з дошак. Кругом з дрэва добрага. Частка ад Буга – выгарэла; жалезная брама адкрываецца на дзве стараны. Для ўцякання. У вале зроблены ход, выраблены дзеравам, з дзвюма дзвярамі. У шыі [вузкім месцы] адна. А другая ўнутраная на дзве стараны ад-

крываецца), дзе порахі, свінец і кулі; солі бачковай упакованай у замку засталося 100 бочак...» .

Нават хуткі погляд на інвентар 1661 г. сведчыць пра тое, што Берасцейскі замак быў яшчэ ў стане вытрымаць доўгую асаду, але склаўшаяся ў канцы 1660 г. ваенна-палітычная сітуацыя была не на карысць Масковіі, што і прымусіла «маскоўскіх сядзельцаў» у замку замест павольнай гібелі капітуляваць. Для нас гэта азначае – аставіць абжыты замак цэлым. Па сутнасці, як вынікае з інвентару, замак у 1661 г. прадстаўляў сабою цесна забудаваную і добра ўмацаваную фартэцыю, якая, па ацэнцы М. А. Ткачова, магла займаць плошчу прыкладна ў 2 га.

Аб тым, якім заставаўся сам горад у 1661 г., сведчыць іншы дакумент: «Просьба берасцейскіх абываселяў да караля Яна Казіміра, аб дараванні ім некаторых новых праў і аднаўленні былых – старажытных, пасля разбурэння г. Берасця маскоўскім войскам у 1660 г.». З гэтай просьбай да яго звярнулася малая горстка ўцалелых жыхароў Берасця 6 мая 1661 г. Каб адчуць маштаб катастрофы, гэты дакумент трэба прачытаць поўнасцю:

«На враде кгродскомъ Берестейскомъ [горад яшчэ спрабаваў у старарускай літарацыі захаваць дакументальна сваё сапраўднае імя], передо мною Еронимомъ Казимиромъ Еленскимъ, хоружимъ и подстаростимъ Берестейскимъ, [далей пераклад з польскага] засмуціліся, знаходзячыся ў вялікім абагаўленні і пакутах сваіх, і апавядалі, пан Габрыэль Раманоўскі і пан Раман Мацievіч – бургамістры, выбраныя нязначным паспаліцтвам знішчанага горада Я. К. М. Берасця [Brześćkiego] на цяперашні тысяча шэсцьсот шэсцьдзясят першы год, аб наступным: што ў мінулым годзе, тысяча шэсцьсот шасцідзясятым, у месяцы студзені, восьмага дня, калі праціўнік Moskwicin [маскоўскі], уваліўшыся ў горад Берасце [Brześć], не толькі горад, а і таго ж года, месяца студзеня, трынадцатага дня, таксама захапіў замак Берасцейскі [Brzeski]; а пры ўзяцці замка, нябожчык, пан Сямён Сапальскі, пан Васіль Рамановіч – бургамістры, Панас Севашкевіч і Станіслаў Ясецкі – райцы, з другімі сваімі калегамі і нямала паспаліцтва, якія пры сваіх вольнасцях заставаліся ў Берасцейскай [Brzeskiej] фартэцыі, загінулі.

Пры іх гібелі згінулі і ўсе прывілеі, дадзеныя гораду і якія знаходзіліся пры іх, менавіта: века даўняга, набожнай памяці, найяснейшых іх міласці каралей польскіх і вялікіх князёў літоўскіх, на вечныя часы продкамі іх патомству дадзеныя, як тыя прывілеі на гарадскія вольнасці, як і на рамёствы, якія належалі мноству розных цахоў, і цяперашнім найяснейшым Янам Казімірам, каралём польскім і вялікім князям літоўскім, шчасліва пануючым і панам нашым міласцівейшым, таксама пацверджаныя – таксама і ўсе кнігі іх Магдэбургскага права прапалі; і што важна, прапалі падаткавыя квіткі і падымныя з розных пабораў і розных іх міласці паноў пабарцаў, і даўнія аддаванні падымных, належачых скарбу іх каралеўскай міласці, якому яны служылі – ад Moskwicina усё знішчана; і горад Берасце [Brześć] да найменшага будынка разбураны, спалены і асуджаны да знішчэння.

Зыходзячы з вышэй выкладзенага і пасля адступлення непрыяцеля з Берасцейскага [Brzeskiego] замка, нешматлікія мяшчане, якіх Гасподзь Бог міласцю сваёй святой ўратаваў ад непрыяцельскага мяча і дараваў жыццё, вярнуўшыся ў вялікім смутку і жалі на свае пажарыш-



Магчымая лакалізацыя Берасцейскай мынцы ў замку на здымку Google

чы (бо іх вельмі малая горстка засталася), каб город Берасце [Brześć] да канца не знішчыўся і паспалітае мяшчанства размножылася, аднадушна пагадзіліся на бурмістраўства, каб парадак ў сваім горадзе ладам шоў, выбраўшы для гэтага вышэй згаданных асоб; зварочваецца да Яго Каралеўскай Міласці і ўсёй Рэчы Паспалітай, каб яны мелі магчымасць на сваіх вуліцах пабудавацца, молячыся аб літасцівасці і вольнасці, і каб іх знішчаныя прывілеі Я. К. М., пан наш міласцівы, прывілеем сваім устанавіў і пацвярдзіў, над імі ўсімі зжаліўся, зрабіў міласць, і каб ў наступным, ад абставін знішчэння тых спраў і квіткоў падымных, хлопатаў яны якіх-небудзь не цярпелі – патрабуюць таксама, каб гэтае іх расказванне было прынята да гарадскіх берасцейскіх [Brzeskiech] кніг і было туды ўпісана. [Далей на старарускай] Што естъ записано» .

Па сутнасці, гэта вельмі важны дакумент у гісторыі горада, які даў адмашку адраджэння знішчанага ў 1660 г. Берасця, г. зн. пабудовы фактычна новага горада на тым жа самым месцы. Гэтыя важныя абставіны не заўсёды ўлічваюцца пры разгляданні тых альбо іншых пытанняў па гісторыі горада.

## Берасцейская мынца

Як ужо падкрэслівалася, канчатковае рашэнне аб эмісіі шэлегаў альбо «баратынак» у Берасці было прынята 6 ліпеня 1665 г. Вядома, што з 4 снежня 1665 г. па 16 снежня 1666 г. у Берасцейскім манетным двары (мынцы) адчаканілі 240 680 150 медных шэлегаў на суму 2 674 268 злотых і 10 грошаў . На самой справе пасля нескладаных арыфметычных дзеянняў атрымліваецца дзівосны вынік: берасцейскі манетны двор кож-

ную хвіліну «выдаваў на-гара» 7 баратынак альбо медных шэлегаў. Гэта калі праца ішла поўныя суткі без усялякіх перапынкаў і кожны дзень, што ўявіць рэальна вельмі цяжка пры ручной чаканцы манет. З гэтага, прынамсі, выцякае два вынікі: альбо прыведзеная лічба – фальсіфікацыя, альбо працэс чаканкі быў нейк механізаваны.

Паўстае паўнапраўнае пытанне: «у якім месцы знішчанага горада магла знаходзіцца Берасцейская мынца?». Згадаем, што Андросаўскае перамір'е, якім скончылася вайна паміж Масковіяй і Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., было падпісана толькі 9 лютага 1667 г. Такім чынам, у Берасці пасля 1661 г. пры адсутнасці людскіх і матэрыяльных рэсурсаў, калі дзяржава яшчэ знаходзілася ў стане вайны, адсутнічала магчымасць весці нейкія маштабныя работы па ўзнаўленні горада.

Тады лагічным вынікам з гэтага паўстае, што ў знішчаным і неаднаўленым яшчэ горадзе месцам, дзе можна было наладзіць чаканку грошай, мог з'яўляцца толькі замак. На жаль, малалікія пісьмовыя крыніцы таго часу не вызначаюць месца размяшчэння Берасцейскай мынцы ў 1666 г.. Але на карысць такога дапушчэння можа быць і тое, што менавіта Берасцейскі замак, а не горад, падпадаў пад каралеўскую, а значыць, дзяржаўную юрыдыстыку. А эмісія грошай з'ўлялася, зразумела, дзяржаўнай справай.

Калі таксама звярнуць увагу на магчымую механізацыю працэсу чаканкі грошай, аб чым гаварылася вышэй, то ў Берасцейскім замку такое механічнае прыстасаванне, як «фалюш» альбо ступа для таўчэння пораху, якая прыводзілася ў рух вадой, існавала, і яе няцяжка было, у прынцыпе, прыстасаваць таксама для чаканкі манет.

Паўстае таксама лагічнае пытанне: «ці маглі існаваць на той час у Берасці альтэрнатыўныя месцы для такой важнай справы, як эмісія грошай, напрыклад, езуіцкі калегіум альбо іншы кляштар?». Але як растлумачвае Е. Д. Квітніцкая, езуіты ў Берасці з'явіліся ў 1609 г. і спачатку яны знаходзіліся пры прыхадскім касцёле. Потым каля рынку ў 1621 г. набылі каменны дом, а будаўніцтва калегіума развярнулі толькі пасля таго, як ім была перададзена ў 1664–1665 гг. тэрыторыя былых каталіцкіх могілак, якія належалі прыхадскому касцёлу. Касцёл жа езуітаў, узведзены ў 1653–1659 гг., у 1659 г. быў спалены маскоўцамі. І далей: драўляны кляштар аўгусцінцаў толькі ў 1672 г. быў перанесены на Рыначную плошчу Берасця; кляштар бернардзінак у 1655–1660 гг. быў знішчаны; мураваны кляштар бернардзінцаў у час вайны таксама значна пацярпеў і згарэў; кляштар брыгітак быў пабудаваны толькі ў 1751 г.; кляштар дамініканцаў быў знішчаны падчас вайны з Масковіяй; кляштар трынітарыяў быў пабудаваны пазней, у 1730–1760 гг. і г. д.

Тэарэтычна магчымасць існавання манетнага двара пры адным з кляштараў разглядаць можна, але яна вельмі малаверагодная. Напомнім, увесь 1660 г. у Берасцейскім замку знаходзіўся 1 000-ы маскоўскі гарнізон, які вёў несупынныя ваенныя дзеянні ў Берасці і ваколіцах Берасця. Таму горад і яго бліжэйшыя ваколіцы практычна да 1661 г. былі знішчаны.

Яшчэ адна немалаважная акалічнасць на карысць размяшчэння манетнага двара ў замку. Замак у 1666 г. з'ўляўся ваенным абаронным аб'ектам (яшчэ працягвалася вайна), які быў умацаваны і добра ахоўваўся, што для грашовай справы




Магчымая лакалізацыя Берасцейскай мынцы ў замку на розных планах і на здымку Google

было таксама важнай абставінай.

Берасцейскім манетным дваром спачатку распараджаўся Кір Бандзінэлі, верагодна, італьянец. Дакумент 1666 г., з урыўкамі якога будзе цікава пазнаёміцца, склаў аб гэтым часе вельмі рэалістычнае ўражанне:

[Спачатку на старарускай мове, як у дакуменце]. «Упоминальный листъ короля Яна Казиміра, суперъ-интенденту Брестскаго монетнаго двора Киру Бандинели, чтобы работники монетнаго двора не делали оскорбленій Брестскимъ жидамъ... [Далей пераклад з польскага]. Ян Казімір, Божай міласцю кароль польскі і etc. Высакароднаму Цырусу Бандзінэлі, суперінтэнданту Берасцейскай [Brzesckiej] менніцы, дружалюбнаму нашаму падданнаму, міласць наша каралеўская. Высакародны, слушны нам прыяцель! Давялі да нас праз некаторых паноў рады і чыноўнікаў нашых, якія знаходзяцца на гэты час на нашым боку, усе яўрэі Берасцейскага [Brzesckiego] кагала, што рамеснікі і абслуга менніцы Берасцейскай [Brzesckiey], якія на гэты час там знаходзяцца, згаданых яўрэяў без усялякай прычыны ў дамах і на вуліцах не толькі ганебнымі словамі зняважаюць, але таксама абразы і шкоду робяць, і чыняць розныя замахі на іх дабро і здароўе. Мы тады, кіруючыся далейшымі разуменнямі, хацелі б па слушнасці вашай сур'ёзна загадваць, каб знаходзячыся пад тваёю ўладаю слушныя цябе рамеснікі і чэлядзь менніцы Берасцейскай [Brzesckiey] яўрэям Берасцейскім [Brzesckim] ніводнай крыўды і шкоды, знявагі і замахаў на здароўе, як і на іх дабро, не рабілі, патрабавалі гэтага і ў з'явіўшыхся з данясеннем на цябе скаргі, каб справядлівасць неадступна таксама рабілі, інакш не будуць мець паслушэнства сваяго перад нашай міласцю. Дадзены ў Варшаве, дня шаснаццатага месяца Марта, Божага года тысяча шасцісот

шэсцьдзясят шостага, панавання нашага польскага – сямнаццатага, а шведскага – васямнаццатага года…» .

Зразумела, у дакуменце сапраўдная прычына ўзнікшай непрызні паміж рамеснікамі манетнага двара і берасцейскімі яўрэямі не называецца, але аб гэтым няцяжка здагадацца: берасцейскіх яўрэяў рамеснікі пацяснілі з «гаспадарскай» тэрыторыі, якой з'яўляўся замак, і пацяснілі, бачна, грунтоўна. Інакш цяжка зразумець, як мяшчанская звычайная скарга ўзнялася да каралеўскай міласці. Зразумела, што берасцейскі кагал, які быў адсунуты ад вельмі прыбыльнай справы, тут жа запратэставаў. Прыём выпрабаваны. Але звернем увагу на зусім іншае.

У Рэчы Паспалітай тым часам наступіў грашовы калапс. Схамянуўшыся, польскі кароль Ян Казімір у 1667 г. выдаў загад на закрыццё ўсіх манетных двароў, у тым ліку і ліст на апячатванне Берасцейскай мынцы:

«Кароль Ян Казімір, з прычыны трактата пад Ленговічамі і з прычыны пільнай просьбы станаў Рэчы Паспалітай, дае згоду на закрыццё ўсіх манетных двароў у Рэчы Паспалітай. Па гэтай прычыне ён загадвае і жмудскаму каштэляну Ордзе, каб, з атрыманнем гэтага ардынанса, неадкладна быў апячатаны манетны двор і ў г. Берасці. Але так як народжаны Баратыні, Асецкі стараста, утрымальнік гэтага манетнага двара, які трымае кантракт з Рэччу Паспалітаю на чаканку манеты, у адносінах да Рэчы Паспалітай выканаў яго дакладна, а для сябе, згодна гэтаму ж кантракту, не ўспеў адчаканіць да палутара мільёна злотых, то кароль дапускае гэтую меру толькі да наступнага, бліжэйшага сейма».

29 снежня 1667 г. гэты ліст «на врадե кгродскомъ Берестейскомъ» быў падany «ку активованью до квитъ кгродскихъ Берестейскихъ». Змест гэтага ліста не будзем прыводзіць поўнасцю, а толькі згадаем вельмі важнае для нашай тэмы яго галоўнае палажэнне, згодна якому кароль загадаў жмудскаму каштэляну Станіславу Вінцэнцыю Ордзе і дваравіну скарбаваму і пісару Аляксандру Бейнару, каб яны, «старанна праінвентараваўшы ўсе прылады менніцы, іх склалі ў адным склепе і той склеп апячаталі сваімі пячаткамі, а таксама пячаццю пасрэдніка народжанага Баратыні».

Ліст быў напісаны ў Варшаве 28 снежня 1666 г., а закрыццё Берасцейскай мынцы было прыведзена да выканання 29 студзеня 1667 г. . Варшаўскі ж сейм у сакавіку 1667 г. дэклараваў, што без асобага кансэнсусу ў Рэчы Паспалітай манетныя двары не павінны будуць адкрывацца. Лёс Берасцейскай мынцы быў прадвызначаны.

Але ў прыведзеным дакуменце нечакана з'явіўся важны аргумент, які можа дапоўніць перакананне, што мынца магла знаходзіцца менавіта ў замку – гэта існаванне на той час у замку адпаведнага склепа альбо піўніцы, у якім маглі па загаду караля скласці прылады зачыненай мынцы.

Адказ на гэтае пытанне знаходзім у інвентары 1682 г.: «З увахода ад горада мост на двух лёдарэзах пакладзены, але дылі знізу падгніўшыя патрабуюць замены, пасярэдзіне маста паміж лёдарэзамі звод з адной стараны замацаваны ланцугом, да самага замка вароты ўстаўлены па бакам дылямі, але і яны патрабуюць рэстаўрацыі. Ідучы ад брамы да пабудовы па левую руку склепік альбо піўніца мураваная, падпёртая калонамі, якая ператвараецца ў руіну, зверху над шыяй падбіта драніцай. Па правую руку будынак, які знаходзіцца пад адним дахам,



Панарама Берасця на гравюры 1657 года

уваходзячы ў які – сені, а з іх кухня, па левую руку камора з пакойчыкам, пры сабе маючая сені, вакон двое, з правага боку будынка прасеўшыя флігелі, па правую руку пад тым жа дахам хата з флігелем і печ, і з двума вокнамі, з той хата з памяшканнем з вокнамі, на ўсіх дзвярах засоўкі і клямкі…» .

Пэўнае і законнае пытанне: «не тое гэта месца, дзе ў 1666 г. чаканіліся берасцейскія баратынкі?». Прайшло не так шмат часу, усяго 16 гадоў, каб сцёрліся поўнасцю сляды ў замку ад таго манетнага двара, дзе магла адбывацца чаканка берасцейскіх баратынак. Таму звернем увагу на магчымую лакалізацыю піўніцы-склепа ў замку, аб якой дакладна таксама паведамляе Д. Сапега ў «Рэестры замка Берасцейскага…» у 1566 г.: «…пивница великая мурованая за кухнями з вежи старое обваленное ново направена с пятром деревенимъ, а землею прикрита, на филяру зверху кгонтами прикрита… …Кухни две. Перед кухнями кганокъ з двема всходками, въ кухняхъ комори для кухонныхъ речей, лави вкругъ: первая изба по правой руце, в ней оболонъ 4, печъ; з светлици – комора, оболона 1, коминъ от печи и коморка потребная; другая светлица с приходу полеве – оболонъ три, печъ простая, комора и коморка потребная, двери вси на завесахъ…».

Тут нельга не заўважыць важнага ўдакладнення, якое не так часта сустракаецца ў сухіх пераліках рэестра: «...з вежи старое обваленное ново направено с пятром деревенимъ...». Калі прыназоўнік «з» тут разумець, як з бок, то атрымоўваецца, што з боку старой вежы, якая ўжо абвалілася, а такой вежай у замку хутчэй за ўсё магла быць тая, што была пабудавана яшчэ князем Уладзімірам Васількавічам, у каменную піўніцу-склеп вёў уваход з драўляным навесам-пятром, які падпіраўся апорай-філярам, пакрытым зверху гонтам-драніцай.... Нешта шмат чаго пераклікаецца ў двух апошніх дакументах, разнесеных часам, і вельмі малаверагодна лічыць такую сугучнасць простаю выпадковасцю.

На самой справе, як выцякае з таго ж рэестра, «вежа од Мухавца на всходъ сонца», хутчэй за ўсё, і ёсць вежа, пабудаваная князем У. Васількавічам, а значыць, яна лакалізавана па левую руку ад уваходу ў былы замак, альбо сёння на ўсход ад археалагічнага музея «Бярэсце». Калі на больш позніх планах Берасцейскага замка ўмоўны квадрат каменнай пабудовы прыняць за піўніцу-склеп, то ўсё добра пагаджаецца з прыведзенымі вышэй довадамі аб магчымай лакалізацыі

Берасцейскай мынцы ў замку, але канчатковы адказ на пастаўленае пытанне, безумоўна, за археолагамі.

І ўсё ж, што сабой уяўляла берасцейская баратынка? Шэлягі, адчаканеныя на Берасцейскай мынцы, былі падобнымі на віленскія баратынкі: на аверсе – партрэт караля Яна Казіміра, па крузе –надпіс IOAN CAS REX, пад партрэтам – манаграма Бараціні – TLB. На рэверсе – Пагоня, па крузе надпіс SOLI MAG DVC LIT 1665/1666. Над Пагоняю – вялікакняжацкая карона, пад Пагоняю – манаграма падскарбія ВКЛ Гераніма Крышпіна Кіршэнштэйна – KHPL. Але берасцейскія баратынкі адрозніваюцца ад віленскіх малой манаграмай KHPL і Пагоняй, якая мае толькі шчыт без «крылаў».

Але для нашай жа берасцейскай 1000-гадовай гісторыі прыярытэт Берасцейскай мынцы ў Беларусі застаецца бясспрэчным.

**Анатоль Гладышчук**
**(г. Брэст, Беларусь)**


1. Volumina Legum // 679/15. Mennica W.X. Litew. Petersburg, 1860. T. IV. S. 317.
2. Рябцевич В. Н. О чем рассказывают монеты. Минск, 1978. С. 140.
3. Курбатов О. А. «Литовский поход 7168 г.» кн. И. А. Хованского и битва при Полонке 18 июня 1660 г. // Славяноведение. 2003. № 4. С. 25–40.
4. Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве. Мінск : Часопіс «Arche», 2011. С. 114–115.
5. Курбатов О. А. Указ. соч.
6. Касажэцкі К. Пазнач. твор. С. 117.
7. Гладыщук А. А., Никитчик А. Д. Инвентари Берестейского замка и города после 1660 года // Вестник БрГТУ. Гуманитарные науки. Брест, 2013. № 6 (84). С. 42–50.
8. Ткачев М. А. Замки Беларуси. Минск, 2005. С. 41.
9. АВАК (Акты Виленской археографической комиссии). Акты Брестскаго гродскаго суда. Т. III. Вильна, 1870. С. 362–363.
10. Сінчук Й. Бэрысьтіјська мінныця в 1665–1666 роках // Літвјежа (поліська) штудіјно-прахтыцька конферэнцыя. Пынськ, 1990.
11. Басов С. В., Гладыщук А. А. Рурмус – основной элемент системы водоснабжения Берестейского замка XVI века // Архитектурное наследие Прибужского региона. Сохранение и культурно-туристское использование. Брест, 2010. С. 45–50.
12. Квитницкая Е. Д. Белорусские коллегиумы XVIII в. // Архитектурное наследство. М., 1972. Т. 19. С. 12–26.
13. Вялікае княства Літоўскае. Т. 1. Мінск, 2005. С. 318–321.
14. АВАК. Акты Брестскаго гродскаго суда. Т. IV. Вильна, 1870. С. 29.
15. Там же. С. 33.
16. Volumina Legum // 947/83. Męnica. Petersburg, 1860. T. IV. S. 447.
17. Гладыщук А. А., Никитчик А. Д. Указ. соч.
18. Описание староства Берестейскаго // Документы Московскаго архива Министерства юстиции. М., 1897. Т. 1. С. 205–448.
19. Рябцевич В. Н. Нумизматика Беларуси. Минск, 1995. 687 с.